ПРАВААБАРОНЦЫ
ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

# Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

## Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 8-14 чэрвеня 2020 года.

*Назіранне за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт" і ПЦ "Вясна" ў рамках кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"*

## Высновы

- выбарчая кампанія праходзіць у атмасферы страху, запалохвання выбаршчыкаў і ціску на актывістаў ініцыятыўных груп. Адбываецца прэсінг актывістаў ініцыятыўнай группы па вылучэнні Святланы Ціханоўскай, якая вымушана была скасаваць пікеты па зборы подпісаў у буйных гарадах, а таксама на прэтэндэнта на прэзідэнцкую пасаду Віктара Бабарыку;

- прад'яўленне абвінавачванняў па падзеях 29 мая ў Гродна выклікала негатыўную рэакцыю нацыянальнай праваабарончай супольнасці і міжнародных арганізацый;

- праваабарончыя арганізацыі Беларусі выступілі з тэрміновай заявай, у якой патрабавалі ад уладаў спыніць ціск і запалохванне людзей у сувязі з іх удзелам у выбарчай кампаніі і забяспечыць поўную рэалізацыю фундаментальных правоў і свабод чалавека;

- нягледзячы на ранейшыя затрыманні актывістаў і сяброў ініцыятыўных груп, пікеты па зборы подпісаў, па звестках назіральнікаў, актыўна праходзяць у большасці рэгіёнаў у адносна спакойнай абстаноўцы, без правакацыі і перашкод з боку мясцовых улад і сілавых структур. У некаторых гарадах, як і раней, стаяць чэргі каб аддаць свой подпіс за вылучэнне альтэрнатыўных кандыдатаў;

- некаторыя назіральнікі ўжо атрымалі адказы на свае пісьмовыя звароты аб забеспячэнні магчымасці назіраць працэдуру праверкі подпісаў. Ва

ўсіх выпадках ТВК адмовілі ім, спасылаючыся на тое, што Выбарчы кодэкс гэтага не прадугледжвае;

- зноў фіксаваліся факты выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу і аказання ціску падчас збору подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты дзеючага кіраўніка краіны. Нягледзячы на заявы А. Лукашэнка аб тым, што на прыватных прадпрыемствах звальняюць тых, хто адмаўляецца падпісацца за альтэрнатыўных кандыдатаў, назіральнікамі кампаніі не адзначаны ніводзін такі выпадак;

- 11 чэрвеня на доўгатэрміновую назіральніцу кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Алену Маслюкову быў складзены пратакол па ч. 1 арт. 23.34 КаАП (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў). Яна абвінавачваецца за ўдзел 31 траўня ў пікетаванні ў мясцовым скверы. У сувязі з гэтым кампанія "Праваабаронцы за свабодныя выбары" выказвае рашучы пратэст супраць пераследу Алены Маслюковай і патрабуе неадкладна спыніць адміністрацыйны працэс, які быў распачаты ў дачыненні да яе ў сувязі з ажыццяўленнем законнай праваабарончай дзейнасці;

- у большасці беларускіх СМІ тэма пандэміі COVID 19 як інфанагода адсунулася на другі план у параўнанні з навінамі выбарчай кампаніі.

**Агульная сітуацыя**

Назіральнікі з рэгіёнаў апісываюць цяперашнюю сітуацыю як напружаную: грамадзян Беларусі абурае непаважлівае стаўленне ўлады да народу і да асобных удзельнікаў выбарчай кампаніі, пераслед актывістаў і несправядлівыя суды над імі. Дзейнасць дзяржаўных структур па забеспячэнні выбарчага працэсу, якая і раней характарызавалася непразрыстасцю, зараз адбываецца ў яшчэ больш закрытым рэжыме, чаму садзейнічае эпідэміялагічная абстаноўка ў краіне.

8 чэрвеня семярым удзельнікам пікета па зборы подпісаў грамадзян у падтрымку вылучэння ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Святланы Ціханоўскай, які адбываўся 29 мая ў г. Гродна, – Сяргею Ціханоўскаму, Дзмітрыю Фурманаву, Вяргілію Ушаку, Аляксандру Арановічу, Васілю Бабpоўскаму, Арцему Сакаву і Уладзіміру Навуміку было прад'яўленае абвінавачванне ў арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і звязаныя з яўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады, і ў актыўным удзеле ў такіх дзеяннях (частка 1 артыкула 342 КК Рэспублікі Беларусь). Двое з затрыманых

пераследуюцца за гвалт у дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі. 12 чэрвеня стала вядома аб прад’яўленні абвінавачвання па арт. 342 КК Андрэю Новікаву – валанцёру ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай. 9 чэрвеня ў доме Новікава ў Прусах прайшоў ператрус[1].

9 чэрвеня шэраг праваабарончых арганізацый Беларусі, у тым ліку арганізацыі-удзельнікі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”, прызналі крымінальны пераслед вышэйназваных асоб палітычна матываваным, а вышэйназваных асоб – палітычнымі зняволенымі[2].

Еўрапейскія структуры таксама адрэагавалі на прад’яўленне абвінавачванняў па падзеях 29 мая ў Гродна. 8 чэрвеня пастаянны дакладчык Еўрапейскага парламента па Беларусі, дэпутат ад Літвы Пятрас Аўштравічус звярнуўся да віцэ-старшыні Еўрапейскай камісіі, вярхоўнага прадстаўніка Еўрасаюза па замежных справах і палітыцы бяспекі Жозепа Барэля з просьбай адрэагаваць на падзеі ў Беларусі і рэпрэсіі ў дачыненьні да дэманстрантаў і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці[3].

Афіцыйны прадстаўнік кіраўніка дыпламатыі ЕС Жозепа Барэля Петэр Стана, адказваючы на пытанне карэспандэнта DW падчас брыфінгу 9 чэрвеня ў Бруселі[4], адзначыў наступнае: “Еўрапейскі Саюз лічыць, што абвінавачванні, вылучаныя Следчым камітэтам (СК) Беларусі супраць Сяргея Ціханоўскага і сямі іншых актывістаў, з'яўляюцца неабгрунтаванымі, таму іх варта зняць”.

12 чэрвеня стала вядома пра працягненне амерыканскіх санкцый супраць пэўных грамадзян і асобных членаў кіраўніцтва Беларусі, якія былі ўведзены ў 2006 годзе. Як паведамляецца на афіцыйнай старонцы Белага Дома, “дзеянні і палітыка некаторых членаў урада Беларусі і іншых асоб, накіраваныя на падрыў дэмакратычных працэсаў у Беларусі, парушэнні правоў чалавека, палітычныя рэпрэсіі і карупцыя працягваюць прадстаўляць пагрозу нацыянальнай бяспецы і знешняй палітыцы ЗША”[5].

11 чэрвеня ў галаўным офісе Белгазпрамбанка, з якім была звязаная прафесійная дзейнасць вылучэнца ў кандыдаты ў Прэзідэнты Віктара Бабарыкі, прайшлі ператрусы. Паводле афіцыйнай версіі, супраць прадстаўнікоў камерцыйных структур, былых і дзеючых работнікаў банка распачата крымінальная справа па ч. 2 арт. 243 і па ч. 2 арт. 235 КК. 12 чэрвеня Дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю

[1] https://spring96.org/be/news/97479
[2] http://spring96.org/be/news/97481
[3] Арыгінал на літоўскай мове: http://www.austrevicius.lt/lt/naujienos/n/614-reikalauju-neatideliotinos-ir-grieztos-es-reakcijos-i-neleistinus-procesus-baltarusijoje
[4] www.dw.com/ru/ес-призвал-беларусь-снять-обвинения-с-тихановского-и-других-активистов/a-53744233
[5] Арыгінал на ангельскай мове: https://www.whitehouse.gov/briefings-statements/text-notice-continuation-national-emergency-respect-belarus-2/

заявіў аб датычнасці Віктара Бабарыкі да супрацьпраўнай дзейнасці. А. Лукашэнка паведаміў, што па справе «Белгазпрамбанку» затрыманыя прыкладна 15 чалавек. Стала вядома пра затрыманні членаў ініцыятыўнай групы Віктара Бабарыкі: у Магілёве гэта каардынатар па Магілёўскай вобласці Уладзімір Дудараў і Сяргей Кармызаў. У рэгіёнах некаторыя сябры ініцыятыўнай групы названага вылучэнца перасталі выходзіць на сувязь, некаторым на неабгрунтаваных падставах былі вынесеныя папярэджанні аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці.

11 чэрвеня ў Светлагорску на доўгатэрміновую назіральніцу кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”, праваабаронцу “Вясны” Алену Маслюкову, грамадзянскіх актывістаў Сяргея Біствіцкага і Віктара Ахрамчука супрацоўнікі міліцыі склалі пратаколы па ч. 1 арт. 23.34 КаАП (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў).

Кампанія “Праваабаронцы за свабодныя выбары” выказвае рашучы пратэст супраць пераследу Алены Маслюковай і патрабуе неадкладна спыніць адміністрацыйны працэс, які быў распачаты ў дачыненні да яе ў сувязі з ажыццяўленнем ёй законнай праваабарончай дзейнасці.

У Віцебску ўлады працягваюць ціск на ўдзельнікаў легальных пікетаў, якія адбыліся ў канцы мая – пачатку чэрвеня. Суды Чыгуначнага, Кастрычніцкага і Першамайскага раёнаў горада прысуджаюць удзельнікам буйныя штрафы ці адміністрацыйныя арышты на розныя тэрміны.

**Заявы**

11 чэрвеня восем арганізацый – прадстаўнікоў праваабарончай супольнасці Беларусі выступілі з тэрміновай заявай, у якой патрабуюць ад уладаў спыніць ціск і запалохванне людзей у сувязі з іх удзелам у выбарчай кампаніі і забяспечыць поўную рэалізацыю фундаментальных правоў і свабод чалавека, замацаваных у Канстытуцыі, Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах, Капенгагенскім дакуменце і ў іншых міжнародна-прававых дакументах у сферы правоў чалавека.

11 чэрвеня патэнцыйная кандыдатка ў прэзідэнты Беларусі Святлана Ціханоўская выступіла з відэазваротам, у якім заявіла аб зняцці ўсіх сваіх пікетаў у абласных цэнтрах і сталіцы на 12, 13 і 14 чэрвеня. Эксперты кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” лічаць гэта рашэнне вынікам жорсткай кампаніі пераследу выбарчага штаба і членаў ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай.

Праваабаронца Павел Левінаў звярнуўся да старшыні ЦВК з просьбай даць прававую ацэнку заяве кіраўніка дзяржавы, зробленай ім 4 чэрвеня, якая выклікала ў грамадстве негатыўны рэзананс. У ёй, на думку праваабаронцы,

А. Лукашэнка, публічна выказаў пагрозы жыццю простых выбарцаў. 11 чэрвеня ў сваім адказе старшыня ЦВК паведаміла, што ў прыведзеных фактах не бачыць парушэнняў выбарчага заканадаўства.

**Пасяджэнні ТВК**

Праз тыдзень завяршыцца збор подпісаў і пачнецца працэдура іх праверкі ТВК. Назіральнікі кампаніі звяртаюцца ў ТВК з пісьмовай просьбай забяспечыць магчымасць назіраць працэдуру праверкі подпісаў. Ужо атрыманы адказы ў Магілёве (Кастрычніцкая раённая ВК), у Гомелі (Цэнтральная раённая ВК), Калінкавічах і Хойніках, якія паказваюць, што пакуль ніводная ВК не дазволіла назіральнікам прысутнічаць пры праверцы подпісаў. Ва ўсіх выпадках спасылаліся на тое, што арт. 13 ВК не прадугледжвае права назіральнікаў прысутнічаць пры праверцы подпісаў.

У сувязі з гэтым адзначаем, што праверка подпісаў выбаршчыкаў з’яўляецца важнай працэдурай, падчас якой высвятляецца іх сапраўднасць. ВК не прадугледжвае прамога права назіральнікаў прысутнічаць падчас праверкі подпісаў, аднак такое права вынікае з прынцыпу галоснасці і адкрытасці падрыхтоўкі і правядзення выбараў, замацаванага ў арт. 13 ВК.

**Збор подпісаў**

Працягваецца збор подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты. На гэтым тыдні ён праходзіў у больш спакойнай абстаноўцы, без правакацый і перашкод з боку мясцовых улад. Зборшчыкі подпісаў выконваюць рэкамендацыі ЦВК па медычнай бяспецы.

Некаторыя назіральнікі адзначылі павышаную ўвагу праваахоўных органаў і мясцовых уладаў, да пікетаў, якія праходзілі з удзелам саміх прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду. Так, 8 чэрвеня ў Віцебску на пікеце па зборы подпісаў, на якім выступаў Валер Цапкала, знаходзіліся некалькі супрацоўнікаў міліцыі ў грамадзянскай форме, адзін з іх здымаў выступ, стоячы блізка ад выступоўцы. Прысутнічаў таксама старшыня Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта Вадзім Заранкін.

Нягледзячы на ранейшыя затрыманні, па звестках назіральнікаў, пікеты па зборы подпісаў праходзяць у многіх рэгіёнах, на іх вядзецца праца па фарміраванні спісаў будучых назіральнікаў. Людзі запісваюцца даволі актыўна.

Зноў фіксаваліся факты выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу і аказання ціску падчас збору подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты дзеючага кіраўніка краіны, нягледзячы на тое, што, па завярэнні кіраўніка яго

ініцыятыўнай групы М. Орды, у падтрымку А. Лукашэнкі сабрана больш за мільён подпісаў (па стане на 5 чэрвеня)[6].

У канцы мая кампанія “Праваабаронцы за свабодныя выбары” запусціла форму для збору фактаў выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу пры вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты. За час яе работы праваабаронцам паведамілі ўжо каля сотні фактаў прымусу падпісваца за вылучэнне кандыдатам А. Лукашэнкі. Прыкладна чвэрць з іх – пагрозы звальнення ў той ці іншай форме, якія выказываюцца ў адрас працаўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў у выпадку іх непадпарадкавання.

10 чэрвеня на пікеце ФПБ, БРСМ і “Белай Русі” ў падтрымку А. Лукашэнкі, дзяржслужачыя Гродзенскага аблвыканкама, гарвыканкама, раённых адміністрацый, ідучы з працы, масава падпісваліся за А. Лукашэнку пад наглядам сваіх кіраўнікоў, якія стаялі непадалек, назіраючы за працэсам. У Оршы дзяржслужачым, супрацоўнікам праваахоўных органаў забаронена заходзіць на плошчы і месцы, дзе збіраюцца подпісы за вылучэнне дэмакратычных кандыдатаў.

Арганізаваны збор подпісаў ў падтрымку дзеючага Прэзідэнта прайшоў у цэхах ААТ “СветлагорскХімвалакно”, ААТ “Светлагорскі ЦКК”. Звесткі аб прымусе да збору подпісаў паступаюць з Крычаўскага раёна, дзе каардынатарам ініцыятыўнай групы А. Лукашэнкі з'яўляецца старшыня Крычаўскага раённага Савета дэпутатаў І. В. Пруднікава. Паведамляюцьаб гэтым з буйнога прадпрыемства “Крычаўцэментнашыфер”, Лакаматыўнага дэпо і інш., але пры гэтым людзі ўхіляюцца ад напісання афіцыйных скаргаў з-за страху страціць працу.

Разам з тым, праваабаронцам вядомы канкрэтныя факты ціску на апазіцыйна настроеных грамадзян у Светлагорску, Наваполацку і інш.

Нягледзячы на заявы дзеючага Прэзідэнта аб тым, што на прыватных прадпрыемствах звальняюць тых, хто адмаўляецца падпісацца за вылучэнне альтэрнатыўных кандыдатаў, назіральнікамі кампаніі не зафіксаваны ніводны такі выпадак. Такой інфармацыі не паступіла і ў згаданую вышэй форму, створаную кампаніяй “Праваабаронцы за свабодныя выбары”.

### Выбары ў СМІ

Раней у беларускіх медыя тэма пандэміі COVID 19 як інфармацыйная нагода займала лідзіруючую пазіцыю. Зараз па асвятленні ў большасці беларускіх СМІ яна адсунулася на другі план у параўнанні з навінамі выбарчай кампаніі.

[6] https://1prof.by/news/obshhestvo-i-profsoyuzy/mihail-orda-na-segodnyashnij-uzhe-sobrano-poryadka-milliona-podpisej-za-aleksandra-lukashenko/

Найбольш актыўна незалежныя СМІ публікавалі матэрыялы пра затрыманні супрацоўнікаў штаба Віктара Бабарыкі і ўзбуджэнне крымінальнай справы па Белгазпрамбанку. Таксама ў фокусе ўвагі былі прыпыненне працы пікетаў па зборы подпісаў за Святлану Ціханоўскую ў Мінску і абласных гарадах і прамова дзеючага Прэзідэнта на працоўных нарадах і падчас візіту ў Полацк.

Парталы "Наша Ніва", "Радыё Свабода", TUT.BY і Naviny.by інфармуюць праважна пра перадвыбарчае супрацьстаянне дзеючага Прэзідэнта з прэтэндэнтам Віктарам Бабарыкам і развіццё "справы Белгазпрамбанку". Пішуць пра факты ціску на прыхільнікаў альтэрнатыўных кандыдатаў на працы (пагрозы, непрацягненне кантрактаў і інш.). "Радыё Свабода" дае рэтраспектыўныя падборкі на гэту тэму.

Партал тэлеканала "Белсат" актыўна асвятляе бягучыя падзеі выбарчай кампаніі і публікуе аналітыку пра перспектывы рэгістрацыі кандыдатаў. Апроч таго, "Белсат" паведамляе пра ход затрыманняў прыхільнікаў Сяргея Ціханоўскага. Партал "Беларускае Радыё Рацыя" паведамляе пра магчымасць далучыцца да назірання за выбарамі праз ініцыятыву "Шчырыя людзі".

На партале "СБ. Беларусь сегодня" навіны выбарчай кампаніі ніяк не выдзяляюцца з агульнай плыні. Сярод выбарчых падзей, узгаданых sb.by у справаздачны перыяд, – выказванні главы дзяржавы падчас нарадаў 9 і 10 чэрвеня і візіту ў Полацк 12 чэрвеня, тлумачэнне Л. Ярмошынай парадку запрашэння міжнародных назіральнікаў.

Радзей у прэсе асвятляецца ход кампаній іншых прэтэндэнтаў (Ганны Канапацкай і Вольгі Кісель). "Белсат" выпускае праграмы з удзелам Алеся Таболіча, Андрэя Дзмітрыева і Мікалая Казлова. Партал "Новы Час" публікуе заклік прэтэндэнта ў кандыдаты Юрыя Губарэвіча да правядзення мітынгу прыхільнікаў перамен.

Навіны выбараў шырока асвятляюцца ў Telegram-каналах. Акрамя вядомага канала "Беларусь головного мозга" (аудыторыя больш за 130 тыс.), бягучыя падзеі кампаніі адсочвае шэраг тэматычных каналаў: "Выборы. Беларусь" (больш за 19 тыс.), "Выборы видишь?" (больш за 13 тыс.) і інш.